XII З'ЕЗД ВЛКСМ

Прамова тав. А. Н. Аксёнава

Сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі

Таварышы! Зараз, калі партыя арганізуе круты ўздым сельскай гаспадаркі і прамысловасці тавараў народнага спажывання, усё больш узрастае адказнасць камсамола за выхаванне моладзі і мабілізацыю ўсіх яе сіл на актыўны ўдзел у камуністычным будаўніцтве. Яшчэ вастрэй паўстаюць задачы далейшага ўдасканалення ўсёй арганізацыйнай і ідэйна-палітычнай работы камсамола. Гэтыя задачы прад'яўляюць да камсамольскіх арганізацый высокія патрабаванні, якія павінны ўлічвацца ў практычнай рабоце і якія павінны быць адлюстраваны ў Статуце ВЛКСМ.

Вучачыся ў партыі і пераймаючы яе багацейшы вопыт, камсамол пастаянна ўдасканальвае сваю арганізацыйную работу, адпаведна новым задачам развівае і арганізацыйныя прынцыпы, якія ўвасоблены ў Статуце ВЛКСМ.

Беларуская дэлегацыя аднадушна падтрымлівае дапаўненні да ўступнай часткі Статута, якія ўказваюць на ролю і месца камсамола як памочніка Камуністычнай партыі ў ажыццяўленні яе галоўных задач — пабудовы камуністычнага грамадства шляхам паступовага пераходу ад сацыялізма да камунізма, няспыннага павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню грамадства, выхавання членаў грамадства ў духу інтэрнацыяналізма і ўстанаўлення брацкіх сувязей з працоўнымі ўсіх краін, усямернага ўмацавання актыўнай абароны Савецкай Радзімы ад агрэсіўных дзеянняў яе ворагаў. Гэтае дапаўненне да Статута больш правільна і больш поўна вызначае задачы ВЛКСМ на цяперашнім этапе, указвае на галоўны кірунак у рабоце камсамола.

Улічваючы новыя задачы, камсамол павінен павышаць патрабавальнасць да членаў камсамола. Неабходна, каб кожны камсамолец быў актыўным барацьбітом за ажыццяўленне палітыкі Камуністычнай партыі, каб ён усямерна ўмацоўваў рады камсамола і тым садзейнічаў павышэнню яго боездольнасці і арганізаванасці. Камсамолец надзелен вялікім давер'ем, карыстаецца павагай народа, моладзі. Ён павінен быць варты гэтага давер'я, памятаючы, што яно заваёўваецца самаадданай барацьбой за справу партыі. Дапаўненні, якія ўносяцца да параграфа Статута аб абавязках членаў ВЛКСМ, таму своечасовыя і вельмі важныя. Яны пашыраюць круг абавязкаў членаў ВЛКСМ, патрабуюць ад камсамольцаў актыўнага ўдзелу ў камуністычным будаўніцтве, абавязваюць смела развіваць самакрытыку і крытыку знізу, выкрываць недахопы і дабівацца іх ліквідацыі, строга захоўваць камсамольскую дысцыпліну.

Мы падтрымліваем і іншыя дапаўненні, унесеныя ЦК ВЛКСМ да Статута.

У дакладах на з'ездзе і ў выступленнях дэлегатаў былі падвергнуты суроваму, але справядліваму разбору недахопы ў дзейнасці камсамольскіх арганізацый. Яны поўнасцю адносяцца і да камсамольскіх арганізацый Беларусі.

Наяўнасць гэтых недахопаў сведчыць аб сур'ёзных недахопах у рабоце з кадрамі з боку кіруючых камсамольскіх органаў і перш за ўсё ЦК ВЛКСМ. У нас яшчэ вялікая і частая змянальнасць кадраў. Тлумачэнне гэтаму трэба шукаць у буйных памылках, якія дапускаюцца пры падборы кадраў; бюракратызм і тут заняў трывалае месца. У ЦК ВЛКСМ усё яшчэ не зжыта практыка падбору кадраў па анкетных даных. Аб работніку мяркуюць часта па ўражаннях ад гутаркі, па таму, як ён трымаўся ў час гутаркі, а не па выніках яго практычнай работы. Таму на камсамольскай рабоце часам аказваюцца людзі, якія не спраўляюцца з даручанай справай.

Уся дзейнасць ЦК ВЛКСМ павінна паказваць сабой узор правільнага і ўмелага выхавання кадраў. Для ўсіх нас, камсамольскіх работнікаў, выклік у ЦК ВЛКСМ з'яўляецца вялікай школай. Мы, безумоўна, разумеем, што ў ЦК павінны строга патрабаваць за работу. Аднак нельга прызнаць правільным, калі ў ЦК ВЛКСМ часта караюць камсамольскіх работнікаў, аб'яўляючы ім суровыя спагнанні. Зразумела, спагнанне як мера выхавання неабходная. Але відавочна таксама, што гэтая мера не можа папоўніць буйных недахопаў у рабоце з кадрамі. Мы жадалі-б, каб пасля кожнага выкліку ў ЦК у работнікаў паяўляліся новыя думкі, ідэі, планы, расло і мацнела імкненне яшчэ лепш працаваць, мацнела ўпэўненасць у сваіх сілах.

Велізарнае значэнне для нашых кадраў мае абагульненне вопыту. Перш за ўсё неабходна абагульненне вопыту работы сельскіх райкомаў камсамола. Нічога істотнага пакуль у гэтых адносінах не зроблена. Чаму, напрыклад, «Комсомольская правда» не спрабуе паказаць работу сельскіх райкомаў на старонках газеты? Усе мы добра памятаем павучальны артыкул пад загалоўкам «На сярэднім узроўні» ў «Праўдзе» з поваду работы сельскіх райкомаў партыі. Гэты артыкул надоўга застаўся ў памяці. Ён узбудзіў многа думак, прымусіў задумацца кожнага з нас над сваёй работай. Да гэтага часу адчуваеш гэты добры асвяжаючы ўплыў артыкула. А рэдакцыя «Комсомольской правды» пакуль вельмі мала і не заўсёды ўдала друкуе такія матэрыялы.

За апошні час у нас пераcталі пісаць аб добрай рабоце сакратароў райкомаў, а гэта неабходна, асабліва для сакратароў сельскіх райкомаў. Хацелася-б, каб ЦК ВЛКСМ праз газету «Комсомольская правда», часопіс «Молодой коммунист» аказаў дапамогу сельскаму райкому камсамола.

Нашы далейшыя поспехі залежаць ад перабудовы работы ўсіх кіруючых камсамольскіх органаў. На першы план вылучаецца жывая арганізатарская работа, жывая сувязь з людзьмі. Нельга лічыць правільным, калі адказныя работнікі ЦК, якія выязджаюць у мясцовыя арганізацыі, па-ранейшаму застаюцца ў ролі наглядальнікаў, рэгістратараў падзей і не выступаюць у ролі арганізатараў. Ці правільная такая практыка, калі работнікі ЦК баяцца выказаць думку, выступіць на сходзе, пленуме, семінары, даць параду, нарэшце, у выпадку патрэбы аказаць і актыўную дапамогу ў рабоце? Камсамольцы хочуць бачыць работнікаў ЦК у ролі баявых, кваліфікаваных арганізатараў, дарадчыкаў камсамольскіх кадраў, якія ўмеюць паказаць, як трэба весці справу.

Таварышы! Кіруючыся ўказаннямі, што дадзены камсамолу ў прывітанні ЦК КПСС нашаму з'езду, рашэннямі з'езда і Статутам ВЛКСМ, які будзе прыняты з'ездам, камсамол Беларусі будзе настойліва змагацца за далейшае павышэнне ўзроўню арганізацыйнай і ідэалагічнай работы, весці барацьбу з недахопамі і на гэтай аснове забяспечваць актыўны ўдзел камсамольцаў, усёй моладзі ў дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве. **(Апладысменты).**

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ